Источник: "Настаўніцкая газета" - 2024-11-01

# Працаваць на стварэнне

**Беларускі прафесійны саюз работнікаў адукацыі і навукі сабраў актывістаў на рэспубліканскі электаральны форум, прысвечаны 30-годдзю інстытута прэзідэнцтва Рэспублікі Беларусь.**

На маладзёжным форуме, які прайшоў у Нацыянальным дзіцячым тэхнапарку, прысутнічалі больш за 140 актывістаў абласных і раённых маладзёжных саветаў прафсаюза адукацыі і навукі, стыпендыятаў Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі і галіновага прафсаюза, старшынь пярвічных прафсаюзных арганізацый навучэнцаў і работнікаў устаноў вышэйшай адукацыі.

У першы дзень форуму адбыўся адкрыты дыялог "Якасць адукацыі — залог паспяховай будучыні" з удзелам міністра адукацыі Андрэя Іванца, намесніка старшыні Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Аляксандра Шчаковіча і старшыні прафсаюза адукацыі і навукі Таццяны Якубовіч.

У ходзе форуму яго ўдзельнікі прайшлі навучанне па чатырох кірунках з лекцыямі і майстар-класамі ад экспертаў: па тэмах інфармацыйнай бяспекі, крымінальнай і адміністрацыйнай адказнасці, па псіхалагічных аспектах работы ў калектывах, а таксама пытаннях электаральнай кампаніі 2025 года.

Экспертамі падчас абмеркаванняў выступілі дэпутаты Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, прадстаўнікі Цэнтральнай выбарчай камісіі, Міністэрства адукацыі і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь, Інстытута сацыялогіі НАН Беларусі, вядучыя журналісты.

— На форуме мы разглядзім пытанні развіцця нашай краіны на працягу 30 гадоў, — сказала Таццяна Якубовіч. — За гэты час Беларусь паказала сваю гістарычную прывабнасць і здольнасць адаптавацца да розных умоў. Наша краіна згуртаваная, незалежная, развіваецца на аснове інтарэсаў народа, сваіх традыцый і гісторыі. Вы зможаце не толькі падзяліцца сваімі ведамі, але і атрымаць новыя, каб пасля распаўсюдзіць іх у сваіх працоўных і студэнцкіх калектывах. Вы сустрэнецеся на дыялогавых пляцоўках і круглых сталах з грамадскімі і палітычнымі дзеячамі, медыяэкспертамі. Жадаю вам плённай работы, каб наша краіна ў найбліжэйшыя гады паступальна развівалася, а мы працавалі толькі на стварэнне, таму што час выбраў нас.

Звяртаючыся да маладзёжных актывістаў, Андрэй Іванец адзначыў:

— Многія з вас нарадзіліся ва ўжо суверэннай Беларусі і ўспрымаюць мінулыя 30 гадоў як гісторыю. Але людзі, якія жылі ў той час, разумеюць, як нашу рэспубліку ўдалося адвесці ад бездані, яны ўсведамляюць, у якой выдатнай краіне мы жывём. І тое, што сёння мы знаходзімся ў Нацыянальным дзіцячым тэхнапарку, — сімвалічна, таму што ў нашай краіне вядзецца комплексная, сістэмная работа з адоранымі дзецьмі. Гэта датычыцца ўсіх дзяцей. І тых, што засталіся без бацькоў: дзяржава цалкам узяла на сябе клопат пра іх. Практычна 90% такіх дзяцей знаходзяцца на сямейных формах уладкавання. Мы ствараем усе неабходныя ўмовы для дзяцей, якія маюць асаблівыя адукацыйныя патрэбы. Ніводнае такое дзіця не застаецца па-за ўвагай. Іх мы ўключаем у адукацыйны працэс разам з астатнімі навучэнцамі.

Міністр нагадаў і аб патрэбах моладзі, што вучыцца ў каледжах і ўніверсітэтах, на якія варта своечасова рэагаваць. Атрыманне прафесійнай адукацыі сёння накіравана на тое, каб маладыя людзі маглі рэалізаваць свой патэнцыял у грамадстве, на прадпрыемствах. Вялікая падтрымка аказваецца маладым і мнагадзетным сем'ям. Па меркаванні кіраўніка ведамства, адна з найважнейшых місій кожнага чалавека не толькі ў тым, каб стаць грамадзянінам, прафесіяналам у сваёй сферы, але і ў тым, каб рэалізавацца ў сям'і, выгадаваць дзяцей, пакінуць добры след у жыцці.



> ***Сёння кожны вучань, нават той, хто пражывае ў аддаленым населеным пункце, мае магчымасць атрымаць якасную адукацыю, не горшую, чым у абласных цэнтрах ці сталіцы. Гэта ім гарантуе дзяржава.***
>
> **Андрэй ІВАНЕЦ.**

Аляксандр Шчаковіч нагадаў, што ад якасці адукацыі залежыць будучыня краіны, таму галоўная задача моладзі — вучыцца. Спікер звярнуў увагу і на тое, што ў зале прысутнічаюць лідары меркаванняў, якія могуць павесці за сабой, паказаць і падказаць. Гэта патрабуе ад іх адказнасці, уважлівасці і разумення таго, што адбываецца ў свеце, да чаго трэба імкнуцца. Такія дыялогавыя пляцоўкі дапамагаюць рэальна ацэньваць сітуацыю.

Удзельнікі форуму скарысталіся магчымасцю задаць пытанні ганаровым гасцям аб развіцці сістэмы адукацыі Беларусі, новых тэхналогіях, штучным інтэлекце, эфектыўнасці работы прафсаюза, аб тым, як кожны з нас можа праявіць любоў да Радзімы, і, вядома, аб электаральнай кампаніі.

Размаўляючы з прафактывістамі, Андрэй Іванец падкрэсліў, што сістэма адукацыі павінна адпавядаць патрабаванням часу, і расказаў, што з наступнага навучальнага года плануецца ва ўсіх універсітэтах краіны па ўсіх спецыяльнасцях увесці курс па штучным інтэлекце, але ён будзе спецыялізаваны па кожным кірунку.

**Надзея ЦЕРАХАВА.**
**Фота аўтара.**

Надзея Церахава. Працаваць на стварэнне